©БГПУ

# АГУЛЬНАЕ І АДМЕТНАЕ Ў АБРАДАВЫХ “ХАДЖЭННЯХ” І “ВАДЖЭННЯХ” БЕЛАРУСАЎ

***Г. А. ТАРАСЕВІЧ*, А. Ю. ЛОЗКА**

Object of research are Belarusian ceremony connected with circulations and vozhdeniye. The purpose - studying of the Belarusian ceremonies connected with circulations and vozhdeniye, creation of the program of an author's course on calendar ceremonialism of Belarusians

Ключавыя словы: традыцыйныя абходы, “хаджэнні”, “ваджэнні”, фальклорна-этнаграфічнае дзейства

*Аб’ектам* даследавання з’яўляюцца беларускія абрады, звязаныя з хаджэннямі і ваджэннямі.

*Мэта* – вывучэнне беларускіх абрадаў, звязаных з хаджэннямі і ваджэннямі, іх сістэматызацыя.

Асобнага даследавання агульнасці і адметнасці ў традыцыйных абрадавых абходах у беларускай фальклярыстыцы невядома. Традыцыйныя каляндарныя абходы сялянскіх двароў, хат з выкананнем абрадавых песень, якія вядомы былі ва ўсе поры года (асабліва калядныя і валачобныя), а таксама розныя абрадавыя “хаджэнні” (з “казой”, “канём” і інш.) і “ваджэнні” (“Куста”, “Стралы”, “Русалкі” і г. д.) складаюць аснову народнага тэатра, фальклорна-этнаграфічнага дзейства, дзе прысутнічае выкананне песень, танцаў, тэатралізацыя і з’яўляюцца прыдатным сродкам эстэтычна-мастацкага выхавання падрастаючага пакалення. Гэты багаты матэрыял у плане выхавання, развіцця, пазнання павінен шырока выкарыстоўвацца ў сучаснай школе.

Нягледзячы на тое, што Беларусь – адна з нямногіх еўрапейскіх дзяржаў, дзе ў жывым бытаванні сустракаюцца некаторыя каляндарныя святы, якія з’яўляюцца гісторыка-культурнай каштоўнасцю, зараз яны ўяўляюцца экзотыкай для большасці беларускіх дзяцей і падлеткаў. Зніжаецца роля фальклорна-этнаграфічнага цыкла ў адукацыйных установах ў апошнія гады.

Вынікамі працы стала вылучэнне адметных і агульных рыс абходаў. Прааналізаваны агульны стан вывучэння фальклору ў адукацыйных установах. Былі разгледжаны і сістэматызаваны фальклорныя “хаджэнні” і “ваджэнні”.

З аналізу яе выяўляецца тое, што каляндарныя “ваджэнні” не ўсе мелі традыцыйны песенны тэкст, ці нават, празаічны. Асобна вылучаюцца абрады, звязаныя са святамі, якія ў розныя перыяды гісторыі выконвалі ролю Новага года, дзе выпрацаваліся багатая песеннасць і абходныя віншаванні, тэатралізаваныя шэсці. Заўважаецца канцэнтрацыя каляндарных абрадавых абходаў да дзён, блізкіх да сонцастаянняў (21–22 снежня, 21–22 чэрвеня) і раўнадзенстваў (20–21 сакавіка, 22–23 верасня).

Высокім ўзроўнем тэатралізацыі вызначаецца калядны комплекс. Калядныя святкаванні ўключаюць розныя віды “ваджэнняў” (“Казы”, “Цароў”, “Цыганоў”, “Трох волхваў”, “зоркі”, “батлейкі”, “журава”.)

Вясенні перыяд насычаны ўслаўленнем прыроды (ваджэнне “Куста”, Юраўскі карагод). Традыцыя валачобніцтва вылучаецца віншавальна-велічальнымі песнямі, якія з’яўляюцца своеасаблівымі паэтычнымі календарамі. Нічога падобнага ў славянскім фальклоры няма.

Менш прадстаўлены абрадавымі абходамі летні і восеньскі перыяды. Больш за ўсё насычаны карагоднымі гульнямі веснавы і летні сезоны. Святы свечкі мала тэатралізаваныя і захавалі менш песен з-за пазнейшай пары ўтварэння, не прымеркаванасцю да Новага года.

Фальклор – адзін з важнейшых сродкаў выхавання патрыятызму, любові да сваёй краіны. Таму ў сістэме адукацыі вывучэнне народная спадчыны павінна займаць значнае месца. Зварот да фальклору дапаможа вырашыць адно з вострых пытанняў выхавання вучняў. Гэта абумоўлівае актуальнасць выкладання вуснай традыцыйнай творчасці ў розных навучальных установах нашай краіны, у прыватнасці – у школах.